*УДК 393(476.2-37Рэчыца)*

**М. В. Шкюдзіціс**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

# ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ РЭЧЫЦКАГА РАЁНА

*У артыкуле, які прысвечаны аналізу традыцый пахавальнай абраднасці Рэчыцкага раёна, выкарыстаны ў пераважнай большасці ўласныя запісы аўтара, зробленыя ў вёсцы Перавалока, а таксама аобныя фактычныя матэрыялы, апублікаваный ў зборніку “Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна” (2002 г.). На багатым фактычным матэрыяле разгледжаны пахавальныя абрады і звязаныя з імі мясцовыя народныя вераванні.*

Пахавальная абраднасць беларусаў з’яўляецца важнай часткай традыцыйнай народнай культуры. Яна ўключае ў сябе не толькі сістэму пэўных рытуальных дзеянняў, але і комплекс народных вераванняў, прыкмет і павер’яў, маральна-этычных нормаў. Праз пахавальныя абрады чалавек імкнуўся забяспечыць памерламу спакойны пераход у іншы свет і адначасова абараніць жывых ад магчымай небяспекі, звязанай са смерцю. Варта пагадзіцца з меркаваннем даследчыка У. М. Сысова, што “пахавальная абраднасць па свайму ідэйнаму зместу і этыка-псіхалагічнай накіраванасці ў значнай меры адзіная ва ўсіх славянскіх народаў. Вядомыя нам яе лакальныя асаблівасці не выходзяць за рамкі агульнай традыцыі, а хутчэй выдзяляюць і падкрэсліваюць нацыянальную спецыфіку пахавальных абрадаў” [1, с. 277]. Вывучэнне мясцовай спецыфікі пахавальнай абраднасці важна для вырашэння праблемы ўзбагачэння агульнаэтнічнай пахавальнай традыцыі.

На тэрыторыі Рэчыцкага раёна пахавальная абраднасць захавала многія старажытныя элементы і адметныя лакальныя асаблівасці. У народнай свядомасці смерць успрымалася не як канчатковае знікненне чалавека, а як пераход душы ў іншы стан існавання. Таму ўсе дзеянні, звязаныя з пахаваннем, выконваліся вельмі дакладна і паслядоўна. Парушэнне абраду магло, паводле народных уяўленняў, выклікаць няшчасце для сям’і або нават «вяртанне» памерлага.

Агульнавядома, што ў структуры пахавальнай абраднасці можна вылучыць тры асноўныя перыяды: перадпахавальны, уласна пахаванне і пасляпахавальныя абрады, якія суправаджаліся рознымі рытуаламі, якія фарміраваліся на працягу многіх стагоддзяў.

Перадпахавальны этап быў асабліва насычаным на розныя абрадавыя дзеянні. Адразу пасля смерці чалавека ў хаце завешвалі люстэркі, а часам таксама карціны і вокны. Людзі верылі, што люстэрка

з'яўляецца своеасаблівым праходам паміж светам жывых і памерлых. У адным з запісаў адзначаецца: *"Калі чалавек паміраў, абавязкова завешвалі люстэркі, каб праз іх душа зноў не вярнулася і не забрала каго-небудзь родных сабою"* (в. Красная Дуброва) [2, с. 244].

Акрамя люстэркаў, у некаторых вёсках спынялі гадзіннік, адчынялі вокны і дзверы, каб душа магла свабодна пакінуць дом. У народзе бытавала павер'е, што пасля смерці душа яшчэ нейкі час знаходзіцца побач з роднымі і назірае за ўсім тым, што адбываецца вакол.

Вялікае значэнне мела абмыванне памерлага. Родныя не павінны былі ўдзельнічаць у гэтым абрадзе. Нябожчыка мылі суседзі або знаёмыя. Калі паміраў мужчына, яго мылі мужчыны, калі жанчына – жанчыны. Лічылася, што ўдзел блізкіх людзей у гэтых жалобных дзеяннях можа прынесці новае гора ў сям'ю. Менавіта пра гэта сведчаць і ўспаміны жыхароў вёскі Пераналока, ад якіх пашчасціла запісаць пэўныя звесткі: *"Мыць пакойніка звычайна прасілі старэйшых жанчын, не самых блізкіх родных. Родным цяжка гэта рабіць. Пасля мыцця ваду вылівалі ў такое месца, дзе людзі не ходзяць"* (запісана ў вёсцы Пераналока Рэчыцкага раёна ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.). Памерлага апраналі ў чыстае адзенне. Звычайна маладую дзяўчыну маглі апранаць у вясельнае ўбранне, бо верылі, што на тым свеце яна павінна "дагуляць" сваё жыццё. У труну клалі асабістыя рэчы нябожчыка, якія маглі яму спатрэбіцца ў замагільным жыцці. Паводле ўспамінаў інфармантаў, у труну з нябожчыкам клалі неабходныя рэчы: *"Клалі жанчынам хустку, мужчынам шапку або тытунь. Абавязкова складвалі рукі і давалі ў рукі крыжык. Яшчэ маглі класці грошы на дарогу"* (запісана ў вёсцы Пераналока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.).

Важнае месца ў пахавальнай абраднасці Рэчыцкага раёна займалі галашэнні. Яны з'яўляюцца адным з найбольш старажытных жанраў вуснай народнай творчасці. Звычайна галашэнні выконваліся жанчынамі каля нябожчыка і былі насычаны моцнымі эмацыянальнымі перажываннямі. У іх гучалі боль страты, роспач, звароты да памерлага, успаміны пра яго жыццё. У галашэннях часта выкарыстоўваліся вобразы птушак, якія ў беларускай міфалогіі сімвалізуюць душу чалавека:

*А, Мішка, мой галубок,*
*На каго ж ты мяне аставіў?*
*А з кім мне цяпер жыць?*
*А адкуль мяне цябе ждаць?*
*А дзе мне цябе шукаць?*

*А з якога ты боку прыдзеш?*
*А з якой стараны прыляціш?*

*Ці ты салавейкам, ці ты вірабейкам?* (в. Крынкі) [2, с. 242].

У беларускай міфалогіі птушкі часта ўспрымаліся як пасрэднікі паміж светам людзей і замагільным светам. Лічылася, што “душы памерлых могуць прылятаць да родных у выглядзе птушак” [3, с. 397].

Галашэнні выконваліся не толькі па мужу або жонцы, але і па дзецях, бацьках, братах, сёстрах. Асабліва трагічна гучалі галашэнні маці па дзіцяці, у якіх выкарыстоўваліся пяшчотныя звароты і памяншальна-ласкальныя словы.

На тэрыторыі Рэчыцкага раёна ўласна пахаванне адбывалася на другі або трэці дзень пасля смерці чалавека. Да гэтага часу нябожчык знаходзіўся ў хаце, дзе каля яго чыталі малітвы і псалмы. Уночы каля памерлага заставаліся людзі, якія павінны былі “пільнаваць” нябожчыка.

Труну звычайна выносілі нагамі наперад, што сімвалізавала канчатковае развітанне чалавека з домам і зямным жыццём: “*Труну звычайна выносілі нагамі наперад, каб пакойнік не «вяртаўся» ў хату”* (запісана ў вёсцы Перавалока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.)

Труну неслі мужчыны, пераважна не родныя, а суседзі або сябры. Ім перавязвалі рукі ручнікамі або хусткамі. У пахаванні ўдзельнічала ўся вёска, бо смерць чалавека ўспрымалася як агульнае гора: *“Усёй вёскай дапамагалі. Старэйшыя жанчыны ведалі парадак абраду, як апранаць, як маліцца, што казаць. Мужчыны рабілі труну, капалі магілу, неслі труну”* (запісана ў вёсцы Перавалока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.).

Па дарозе на могілкі пахавальная працэсія магла спыняцца на скрыжаванні дарог. Тут памерлы нібыта развітваўся са сваёй вёскай і роднымі. “Скрыжаванне лічыцца і месцам знаходжння душ памерлых, асабліва закладных нябожчыкаў” [4, с. 303].

Важнае месца ў пахавальнай працэсіі займае крыж. Ён лічыцца ахоўным сімвалам і абавязкова яго неслі наперадзе: *“Перад пахавальнай працэсіяй неслі крыж. Звычайна яго нёс мужчына або хросны. Крыж ішоў наперадзе працэсіі”* (запісана ў вёсцы Перавалока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г.н.).

У беларускай культуры крыж лічыўся моцным ахоўным прадметным атрыбутам-сімвалам. Яго ставілі на магіле як знак памяці і абароны душы памерлага. “Некаторыя аўтары лічылі крыж за сімвал чатырох бакоў свету, іншыя звязвалі з сімволікай Сонца і агню. На думку многіх даследнікаў, крыж сімвалізаваў духоўныя аспекты: узыходжанне духа, імкненне да Бога і вечнасці, Космас, святую прастору, ідэю цэнтральнага божышча” [3, с. 262].

Пасля пахавання адбываліся памінкі. Памінальны стол заўсёды быў абавязковым элементам пахавальнага абраду. На ім павінны былі быць традыцыйныя стравы: боршч, каша, кісель, хлеб. Асаблівае значэнне меў канон – страва з булкі, вады і цукру. “*Канон – гэта абед для памерлага”* (запісана ў вёсцы Пераралока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.).

Памінальныя абрады праводзіліся некалькі разоў пасля пахавання. У народзе верылі, што душа чалавека яшчэ доўгі час знаходзіцца побач з жывымі: “*Паміналі на трэці дзень, гэта сам дзень пахавання. Потым рабілі памінкі на дзявяты дзень*” (запісана ў вёсцы Пераралока ад Марыі Карнееўны Ропат, 1959 г. н.).

Паміналі таксама на саракавы дзень і праз год пасля смерці. Гэтыя дні мелі асаблівае рэлігійнае і сімвалічнае значэнне. Паводле народных уяўленняў, душа толькі пасля сарака дзён канчаткова пакідала зямны свет.

У народным календары Дзяды і Радаўніца былі звязаны з мамінаннем памерлых. У гэтыя дні людзі наведвалі могілкі, прыносілі ежу, маліліся за тых людзей, што пакінулі гэты свет, і ўспаміналі сваіх продкаў. Лічылася, што душы памерлых у гэтыя дні вяртаюцца да сваіх родных.

Шматлікія народныя прыкметы і павер’і былі звязаны са смерцю. Людзі верылі, што выццё сабакі або спеў курыцы (“Калі сабака вые”; “Калі курыца запяе – будзе няшчасце” (г. Рэчыца) [2, с. 248]) прадказваюць хуткую смерць. Нельга было глядзець у акно, калі вязуць нябожчыка (“Калі будзе глядзець праз акно, калі вязуць нябожчыка – памрэ хто-небудзь” (г. Рэчыца) [2, с. 248], бо гэта магло прынесці новае гора. Таксама забаранялася моцна плакаць па памерлым, каб не “цяжарыць” яго душу на тым свеце: “Па нябожчыку нельга вельмі плакаць, бо яму будзе дрэнна на тым свеце” (г. Рэчыца) [2, с. 248].

Такім чынам, пахавальная абраднасць Рэчыцкага раёна захавала багатую сістэму народных традыцый і вераванняў. У ёй цесна пераплятаюцца старажытныя міфалагічныя ўяўленні і хрысціянскія элементы. Праз пахавальныя абрады беларусы імкнуліся захаваць сувязь паміж жывымі і памерлымі, выказаць павагу да продкаў і захаваць для наступных пакаленняў каштоўныя элементы іх традыцыйнай духоўнай культуры.

**Спіс літаратуры**

1 Сысоў, У. М. Структурны аналіз абраду: функцыі рытуальных і вербальных кампанентаў / У. М. Сысоў // Сямейна-абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік, М. А. Каладзінскі; Навук. рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Бел. навука, 2001. – 422 с.

2 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / Укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя артыкулы, рэдагаванне І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ «Нёман», 2002. – 384 с.

3 Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. – Мінск: Беларусь, 2006. – 599 с.

4 Славянская мифология. Энциклопедический словарь. – М.: Эллис Лак, 1995. – 416 с.